УДК 342.7: [364.442:355] (476) «19»

# ПРАВАВЫЯ АСНОВЫ САЦЫЯЛЬНАЙ ПАДТРЫМКІ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ ЛАКАЛЬНЫХ КАНФЛІКТАЎ І ВОІНАЎ-ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТАЎ У БССР У 2-й ПАЛОВЕ ХХ СТАГОДДЗЯ

***І. А. Марцынкевіч***
кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дактарант
Віцебскі дзяржаўны ордэна Дружбы народаў медыцынскі ўніверсітэт

*Артыкул прысвечаны вывучэнню развіцця прававых механізмаў, якія забяспечвалі сацыяльную падтрымку ваеннаслужачых, удзельнікаў лакальных ваенных канфліктаў і воінаў-інтэрнацыяналістаў у пасляваенны перыяд. Аналізуюцца асноўныя тэндэнцыі ў фарміраванні заканадаўства, накіраванага на прадастаўленне ім сацыяльнай дапамогі, разглядаюцца змены ў нарматыўна-прававой базе ў сувязі з грамадска-палітычнымі рэформамі ў вывучаемы перыяд.*

**Ключавыя словы:** сацыяльнае забеспячэнне, сацыяльная дапамога, правы, удзельнікі ваенных канфліктаў, лакальныя канфлікты, воіны-інтэрнацыяналісты, БССР.

## Уводзіны

Пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны, з 2-й паловы 1940-х гг., СССР прымаў актыўны ўдзел у правядзенні розных міжнародных вайсковых і гуманітарных аперацый за межамі краіны. З гэтага часу савецкія ўзброеныя сілы праводзілі цэлы шэраг місій на розных кантынентах. Спецыфіка іх дзейнасці прадугледжвала высокія патрабаванні да адбору вайскоўцаў, па выніках якога праходзіла канчатковае размеркаванне ваеннаслужачых па розных рэгіёнах і кірунках. У далейшым іх дзейнасць таксама адрознівалася высокай ступенню сакрэтнасці і часцей за ўсё праходзіла з выкарыстаннем псеўданімаў і фіктыўных імёнаў. Такія меры гарантавалі бяспеку падчас правядзення аперацый, але разам з тым пасля звальнення з вайсковай службы часта ўзнікалі цяжкасці з атрыманнем ільгот, выплат і іншай сацыяльнай падтрымкі, паколькі фактычна ўдзельнікамі ваенных дзеянняў яны не лічыліся і іх прававы статус заставаўся нявызначаным.

## Асноўная частка

Распрацоўка заканадаўства, якое рэгламентавала іх прававы статус, пачалася толькі ў 1983 г., калі былі ўведзены пасведчанні ўдзельнікаў баявых дзеянняў, якія прыраўноўвалі ваеннаслужачых, што ўдзельнічалі ў лакальных ваенных канфліктах, да ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны [1, с. 69].

Да гэтага часу, паводле сакрэтнай Пастановы ЦК КПСС і СМ СССР 17 студзеня 1983 г. «Аб ільготах вайскоўцам, працоўным і службоўцам, якія знаходзіліся ў складзе абмежаванага кантынгенту савецкіх войскаў на тэрыторыі Дэмакратычнай Рэспублікі Афганістан, і іх сем'ям», вайскоўцам, якія прайшлі ваенную службу ўстаноўлены тэрмін, у выслугу гадоў для прызначэння пенсіі адзін месяц службы залічваўся за тры. Большасць норм закона былі прысвечаны тым, хто атрымаў кантузіі, раненні і захворванні падчас службы, а таксама іх сем'ям [2, с. 286]. Важнай асаблівасцю дакумента стала ўвядзенне ў юрыдычны абарот паняцця «інтэрнацыянальны абавязак». Гэта дазволіла істотна наблізіць катэгорыю тых вайскоўцаў, хто знаходзіўся ў Афганістане, да «вайскоўцаў, якія прымалі ўдзел у баявых дзеяннях у краінах, дзе вяліся баявыя дзеянні» [3, с. 80]. Аднак калі для ўдзельнікаў вайны ў Афганістане статут удзельніка баявых дзеянняў прысвойваўся аўтаматычна, для іншых часта гэта было спалучана з цяжкасцю доказу свайго знаходжання ў «гарачай кропцы», абумоўленай дадатковай засакрэчанасцю звестак [4].

Згодна з пастановай вайскоўцы, звольненыя са службы ў Афганістане, атрымлівалі права на першачарговае забеспячэнне жылой плошчай, а тыя, хто ў выніку баявых дзеянняў атрымалі 1-ю групу інваліднасці, – на забеспячэнне жылой плошчай па-за чаргой. Акрамя таго, удзельнікі Афганскай вайны атрымлівалі права на пазаконкурснае паступленне ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы і пераважнае права на паступленне ў прафесійна-тэхнічныя навучальныя ўстановы і на курсы для навучання адпаведным прафесіям; права на выкарыстанне чарговага штогадовага адпачынку ў зручны для іх час, а таксама на атрыманне дадаткова-

© Марцынкевіч І. А., 2026

га адпачынку без захавання заработнай платы тэрмінам да 2-х тыдняў на год; пераважнае права на забеспячэнне па месцы працы пуцёўкамі ў санаторыі, прафілакторыі і дамы адпачынку, а таксама на ўступленне ў садаводчыя таварыствы (кааператывы). Пры гэтым правы на льготы, прадугледжаныя гэтай пастановай, прадастаўляліся ваеннаслужачым, рабочым і служачым, якія выконвалі інтэрнацыянальны доўг, але не раней за 1 снежня 1979 г. [5].

Чарговым крокам у прадастаўленні льгот воінам-інтэрнацыяналістам стала Пастанова Саўміна СССР 26 ліпеня 1984 г. У адпаведнасці з ёй права на пазачарговае забеспячэнне пратэзаваннем і аўтамабілем «Запарожац» з ручным кіраваннем, пры наяўнасці адпаведных медыцынскіх паказанняў, атрымалі ваеннаслужачыя, якія набылі інваліднасць у ходзе баявых дзеянняў, пры выкананні іншых абавязкаў воінскай службы на тэрыторыі Дэмакратычнай Рэспублікі Афганістан або ў іншых краінах [6].

9 жніўня 1988 г. была прынята Пастанова «Аб дадатковых мерах па паляпшэнні матэрыяльна-бытавых умоў асоб, якія выконвалі інтэрнацыянальны абавязак у рэспубліцы Афганістан, і іх сем'яў». Згодна з дакументам Саветам Міністраў саюзных і аўтаномных рэспублік, а таксама выканкамам было даручана разгледзець пытанне аб устанаўленні персанальных пенсій інвалідам Афганістана або членам сем'яў ваеннаслужачых, якія загінулі ў ДРА. Акрамя таго, інвалідам, якія навучаліся ў ВНУ і ССНУ, прызначалася пенсія ў памеры 100 руб., «пры знаходжанні гэтых студэнтаў і навучэнцаў на поўным дзяржаўным забеспячэнні выплачваць ім стыпендыю ў вышэйшых навучальных установах у памеры 40 руб.» [7].

Асобам, якія атрымалі інваліднасць у Афганістане і навучаліся ў ваенных вучылішчах, належала выплачваць стыпендыі з павышэннем на 20 руб., а тым, хто знаходзіўся на поўным дзяржаўным забеспячэнні, − на 30 руб. Адпаведныя органы абавязваліся працаўладкоўваць былых вайскоўцаў, якія «выконвалі інтэрнацыянальны абавязак у Рэспубліцы Афганістан, пасля звальнення іх з сапраўднай вайсковай службы». Быў усталяваны парадак аплаты працы былых вайскоўцаў за час навучання ў аб'яднаннях, на прадпрыемствах, у арганізацыях і ўстановах. Так, пры асваенні новай прафесіі ім павінны былі выплачваць 100 % тарыфнай стаўкі рабочага за ўвесь перыяд навучання, а пры перападрыхтоўцы, атрыманні другой прафесіі або перакваліфікацыі − захоўваць на ўвесь перыяд навучання з адрывам ад работы сярэднюю заработную плату па існуючай прафесіі і кваліфікацыі.

Былым удзельнікам Афганскай вайны прадастаўляўся беспрацэнтны крэдыт на будаўніцтва дамоў жыллёва-будаўнічых кааператываў, а спагнанне працэнтаў па раней выдадзеных на гэтыя мэты крэдытах спынялася. Разам з тым сем'і загінуўшых у Афганістане вайскоўцаў і працоўных, якія мелі патрэбу ў жыллі, павінны былі забяспечыцца ім да 1989 г. Маці загінуўшых у Афганскай вайне салдат па дасягненні 50-летняга ўзросту атрымлівалі права на пенсію па прычыне страты кармільца.

Жонкам ваеннаслужачых, якія загінулі ў Афганістане, давалася пераважнае права на атрыманне па месцы работы пуцёвак у пансіянаты для сумеснага адпачынку з дзецьмі, а таксама на атрыманне пуцёвак для дзяцей у піянерскія лагеры. Гэтая ж норма распаўсюджвалася на іншых асоб, на ўтрыманні якіх знаходзіліся дзеці загінуўшых вайскоўцаў [2, с. 288].

Прававая катэгорыя «воін-інтэрнацыяналіст» была ўведзена толькі ў 1988 г. Гэта канчаткова аддзяліла ўдзельнікаў ваенных канфліктаў на тэрыторыі іншых дзяржаў ад удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Пасля афіцыйнай публікацыі згаданай пастановы правы на льготы для ветэранаў вайны ў Афганістане афіцыялізаваліся, аднак па-ранейшаму не афішаваліся для шырокага кола грамадства [3, с. 81].

У 1989 г. завяршыўся вывад савецкіх войскаў з Афганістана. У гэтым ваенным канфлікце Беларусь страціла 771 чалавек, каля 30 тыс. беларусаў прынялі ў ім удзел 23 лютага 1989 г. [8]. Пастановай Савета Міністраў БССР было прынята рашэнне аб стварэнні пры выканкамах усіх узроўняў камісіі з ліку дэпутатаў, прадстаўнікоў грамадскасці і былых воінаў-інтэрнацыяналістаў. Ім даручалася на працягу двух месяцаў правесці праверку матэрыяльна-бытавых умоў жыцця кожнага воіна-інтэрнацыяналіста і сям'і загінуўшага, дапамагчы ў атрыманні ўстаноўленых ільгот, аказаць дапамогу ў вырашэнні сацыяльна-бытавых патрэб. Па выніках праверкі абагульненыя матэрыялы абследавання па абласцях і г. Мінску, а таксама тыя, якія патрабуюць рашэння рэспубліканскіх органаў, было прадпісана прадставіць да 15 мая 1989 г. у Камісію пры Прэзідыуме Вярхоўнага Савета БССР. У яе склад увайшлі намеснік старшыні Дзяржпла-

на БССР С. С. Лінг, першы намеснік міністра аховы здароўя БССР К. М. Анішчанка, першы намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі БССР Ю. К. Волчак, дэпутат Вярхоўнага Савета БССР Р. Ф. Дуброўская і інш.

Пастаянным камісіям па ахове здароўя і сацыяльным забеспячэнні, жыллёва-камунальнай гаспадарцы і бытавым абслугоўванні, па справах моладзі, па пытаннях працы і побыту жанчын, аховы мацярынства і дзяцінства Вярхоўнага Савета БССР і адпаведным пастаянным камісіям мясцовых Саветаў народных дэпутатаў было рэкамендавана ўзяць пад кантроль сем'і загінуўшых у Афганістане і садзейнічаць ім у вырашэнні сацыяльна-бытавых пытанняў [9 с. 138-139].

Чарговай мерай, накіраванай на падтрымку воінаў-інтэрнацыяналістаў і іх сем'яў, стала прыняцце 14 ліпеня 1989 г. пастановы Савета Міністраў БССР аб дадатковых ільготах для воінаў-інтэрнацыяналістаў і членаў сям'і ваеннаслужачых, якія загінулі ў Рэспубліцы Афганістан. Згодна з дакументам вайскоўцы, якія праходзілі ваенную службу ў Савецкай Арміі і ВМФ, КДБ СССР і МУС СССР, на тэрыторыі Рэспублікі Афганістан, а таксама членам сямей ваеннаслужачых, загінуўшых або памерлых у выніку раненняў, кантузіі або калецтва, якія атрымалі ў баявых дзеяннях або пры выкананні іншых абавязкаў вайсковай службы, дазвалялася бясплатнае карыстанне аўтобусам, тралейбусам, трамваем, а ў сельскай мясцовасці – аўтобусамі на прыгарадных і міжгародніх маршрутах у межах адміністрацыйнага раёна па месцы жыхарства.

Падставай для бясплатнага карыстання гарадскім пасажырскім транспартам для вайскоўцаў, якія праходзілі службу на тэрыторыі Афганістана, з'яўлялася пасведчанне аб праве на льготы аўтобусамі ў сельскай мясцовасці або дакумент аб праве на льготы з адпаведным укладышам [10, л. 31], гарадскім пасажырскім транспартам і аўтамабілямі ў сельскай мясцовасці для членаў сем'яў ваеннаслужачых, якія загінулі або памерлі ў выніку раненняў, кантузій або калецтваў, атрыманых у баявых дзеяннях або пры выкананні іншых абавязкаў воінскай службы, – пасведчанне, выдадзенае выканкамамі раённых і гарадскіх Саветаў дэпутатаў.

Члены сем'яў ваеннаслужачых, якія загінулі ў выніку раненняў, кантузій або калецтваў, атрыманых у ходзе баявых дзеянняў або пры выкананні абавязкаў ваеннай службы на тэрыторыі Рэспублікі Афганістан, уключаліся ў склад утрыманцаў загінуўшых або памерлых асоб, якім у сувязі з названымі абставінамі прадастаўляліся выплаты пенсіённага характару. Да гэтай катэгорыі адносіліся бацькі, муж (жонкі), якія не ўзялі паўторны шлюб, а таксама дзеці, якія не мелі ўласнай сям'і або мелі сям'ю, аднак сталі інвалідамі да дасягнення паўналецця.

У адпаведнасці з нарматыўнымі прадпісаннямі, якія дзейнічалі ў 1989–1990 гг., абласным і гарадскім выканаўчым камітэтам было даручана забяспечыць замену легкавога аўтамабіля маркі «Запарожац» з ручным кіраваннем інвалідам з ліку ўдзельнікаў баявых дзеянняў у Афганістане. Дадзеную замену прадугледжвалася ажыццявіць бясплатнай перадачай аўтамабіля іншай катэгорыі, які адпавядае медыцынскім паказанням, з кампенсацыяй кошту ў межах кошту мадэлі ЗАЗ-1102 [10, л. 32].

Для рэалізацыі гэтага палажэння па абласцях быў сфарміраваны падрабязны спіс воінаў-афганцаў, атрымаўшых інваліднасць, якім у 1989–1990 гг. планавалася замена аўтамабіля з ручным кіраваннем маркі «Запарожац» на легкавы транспарт іншага вытворцы, агульная колькасць якіх склала 107 чалавек.

У далейшым сацыяльная падтрымка ў адносінах да ўдзельнікаў воінаў-інтэрнацыяналістаў працягвалася. Так, 9 жніўня 1988 г. на падставе пастаноў Савета Міністраў СССР

| Брэсцкая вобласць | Віцебская вобласць | Гомельская вобласць |
|---|---|---|
| 1. Гапановіч Г. В. | 1. Афер А. М. | 1. Аніскавец М. У. |
| 2. Жагальскі В. Г. | 2. Баранаў А. М. | 2. Грышачкін В. Л. |
| 3. Ляўша М. З. | 3. Броўка Г. А. | 3. Захаранка Ю. В. |
| 4. Лемеза А. М. | 4. Брадзягін С. В. | 4. Каламакін Е. Я. |
| 5. Лукашэвіч А. М. | 5. Уладзіміраў С. А. | 5. Макаранка І. М. |
| 6. Альшэўскі В. М. | 6. Галавачоў В. М. | 6. Макаранка Г. І. |
| 7. Сакалоў В. В. | 7. Грынкін А. Л. | 7. Панцялееў А. І. |
| 8. Трубчык В. М. | 8. Дзідзёнак І. М. | 8. Чэпік І. І. |
| 9. Чэмкароў В. М. | 9. Жогаль Ф. П. | 9. Шаршакоў Б. В. |

| | | |
|---|---|---|
| 10. Шкулёў М. С. | 10. Калашнікаў Е. В. | 10. Шырчанка Н. В. |
| | 11. Клюеў В. А. | 11. Шуляк В. А. |
| | 12. Клюшын Г. А. | |
| | 13. Кавалёнак А. П. | |
| | 14. Куклін І. В. | |
| | 15. Кухарэнка І. Л. | |
| | 16. Міраносаў А. В. | |
| | 17. Новікаў А. А. | |
| | 18. Рублёў І. І. | |
| | 19. Сенцюраў С. В. | |
| | 20. Сініца А. Ф. | |
| | 21. Чуць В. В. | |
| | | |
| **Гродзенская вобласць** | **Мінская вобласць** | **Магілёўская вобласць** |
| 1. Вясёлка Г. У. | 1. Бандарчык П. М. | 1. Бібянкоў А. М. |
| 2. Вітко А. А. | 2. Вырва А. П. | 2. Бухавец Г. В. |
| 3. Гарбачык А. А. | 3. Дзідзюля В. Н. | 3. Вальчук П. М. |
| 4. Замкаў С. М. | 4. Дрозд І. І. | 4. Гарбузаў А. П. |
| 5. Запанёнак І. Г. | 5. Кулак Н. Н. | 5. Герашчанка Н. М. |
| 6. Камянецкі С. В. | 6. Мухаратаў Е. С. | 6. Дамарацкі В. М. |
| 7. Кузьмінскі А. Ф. | 7. Петрашэвіч П. В. | 7. Ермакоў Г. К. |
| 8. Машчанскі С. М. | 8. Пракопчык А. В. | 8. Іваноў М. Ф. |
| 9. Мікша Л. С. | 9. Русак М. М. | 9. Казлоў М. І. |
| 10. Нелепка А. Б. | 10. Сільвановіч В. Н. | 10. Лук'янаў С. С. |
| 11. Няўмейчаў В. П. | 11. Смолік А. А. | 11. Маёраў А. В. |
| 12. Арлоўскі В.С. | 12. Субач П. М. | 12. Міхайлаў І. А. |
| 13. Радзівончык П. П. | 13. Хадатовіч А. В. | 13. Петрачэнка Ю. В. |
| 14. Улас Ф. А. | 14. Яскевіч В. А. | 14. Старкоў В. В. |
| 15. Янгурэвіч Р. В. | | 15. Целяхаў В. А. |
| | | 16. Шарстнёў С. М. |
| | | 17. Шпакаў А. М. |
| **г. Мінск** | | |
| 1. Бабенка В. І. | | |
| 2. Быкаў М. Ф. | | |
| 3. Высоцкі Г. А. | | |
| 4. Гелаш М. В. | | |
| 5. Дземідовіч Ю. В. | | |
| 6. Іваноў В. М. | | |
| 7. Кляйменычаў Д. С. | | |
| 8. Капарыха М Ф. | | |
| 9. Курдзюкоў В. М. | | |
| 10. Лукашэвіч А. М. | | |
| 11. Ляшэнка А. С. | | |
| 12. Міхалап У. В. | | |
| 13. Мельнік А. В. | | |
| 14. Нічыпарук Б. А. | | |
| 15. Палазнік В. В. | | |
| 16. Студзянцоў А. В. | | |
| 17. Хамякоў Ю. І. | | |
| 18. Цап У. П. | | |
| 19. Шэлег О. Я. | | |
| **Усяго: 107** | | |

ад «Аб дадатковых мерах па паляпшэнні матэрыяльна-бытавых умоў асоб, якія выконвалі інтэрнацыянальны абавязак у Рэспубліцы Афганістан, і іх сем'яў» і ЦК КП(бы)Б ад 27 лютага 1989 г. Саветам Міністраў БССР было прынята рашэнне, што членам сем'яў ваеннаслужачых, якія загінулі пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязку ў Афганістане, прызначаліся персанальныя пенсіі рэспубліканскага значэння, якія ўстанаўліваліся, у выглядзе выключэння, для ваеннаслужачых-інвалідаў (незалежна ад стажу работы да прызыву ў Савецкую Армію). Іх памеры склалі 160 рублёў у месяц для 1-й групы, 150 рублёў – 2-й групы і 110 рублёў у месяц для 3-й групы.

Для дасягнуўшых 50-гадовага ўзросту маці і жонак загінуўшых ваеннаслужачых выплаты прызначаліся на ўзроўні пенсій, якія яны атрымлівалі на падставе страты кармільца па лініі органаў сацыяльнага забеспячэння або Міністэрства абароны СССР. Разам з тым іх памер павінен быў складаць не менш за 80 рублёў у месяц, а пры дасягненні пенсіённага ўзросту − у максімальным памеры пенсіі персанальнага значэння. Дзецям загінуўшых пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязку таксама былі прызначаны пенсіі па страце карміцеля па лініі органаў сацыяльнага забеспячэння або Міністэрства абароны СССР, але не менш за 60 рублёў на кожнае дзіця [11, с. 162-163].

**Заключэнне**

Такім чынам, сістэма прадастаўлення сацыяльнай падтрымкі ўдзельнікам лакальных канфліктаў і воінам-інтэрнацыяналістам у БССР у другой палове ХХ ст. характарызавалася працяглым і складаным працэсам фарміравання, што было абумоўлена як эканамічнымі, так і грамадска-палітычнымі фактарамі. Пачатак вайны ў Афганістане абумовіў неабходнасць у прадастаўленні льгот і сацыяльнай падтрымкі новай катэгорыі – удзельнікам лакальных канфліктаў. Праца ў гэтым напрамку ішла няпроста, спачатку закранула толькі воінаў-інтэрнацыяналістаў, а потым удзельнікаў іншых лакальных ваенных канфліктаў. Фактычна, можна лічыць, што з пачатку выдачы пасведчання ўдзельнікаў баявых дзеянняў у 1983 г. з'явілася новая вялікая катэгорыя вайскоўцаў, якім давалася дзяржаўная сацыяльная падтрымка. Гэта стала важным звяном сацыяльнага забеспячэння, паколькі вялікая колькасць вайскоўцаў атрымала юрыдычныя падставы хаця б на мінімальныя выплаты і льготы.

***СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ***

1. ***Кузнецова-Тимонова, А. В.*** Воины-интернационалисты из Беларуси в гражданской войне в Анголе / А. В. Кузнецова-Тимонова. – Мн. : Беларуская навука, 2017. – 354 с.
2. ***Агеев, А. А.*** Российское законодательство в отношении ветеранов боевых действий в Афганистане: проблемы, особенности, перспективы / А. А. Агеев // Известия Иркутского государственного университета. Сер. История. – 2012. – № 2–1. – С. 286–287.
3. ***Данилова, Н. Ю.*** Военнослужащие, воины-интернационалисты, ветераны: динамика правового статуса / ***Н. Ю. Данилова*** // Социологические исследования. – 2001. – № 10. – С. 77–85.
4. ***Кузнецова-Тимонова, А. В.*** Белорусские воины-интернационалисты: на примере ветеранов войны в Анголе (1975–1992) / А. В. Кузнецова-Тимонова // Вестник Полоцкого государственного университета. Сер. А. Гуманитарные науки. – 2020. – № 9. – С. 85–87.
5. О льготах военнослужащим, рабочим и служащим, находящимся в составе ограниченного контингента советских войск на территории демократической республики Афганистан, и их семьям : постановление ЦК КПСС, Совета министров СССР, 17 января 1983 г., № 59–27. – URL: https://allbusiness.ru/BPravo/DocumShow_Do umID_32907.html (дата обращения: 23.08.2025).
6. О мерах по дальнейшему улучшению материально-бытовых условий участников Великой Отечественной войны и семей погибших военнослужащих : постановление ЦК КПСС, Совмина СССР, 26 июля 1984 г., № 812. – URL: http://www.bestpravo.ru/sssr/gn-zakony/x5w.htm (дата обращения: 29.07.2025).
7. О дополнительных мерах по улучшению материально-бытовых условий лиц, выполнявших интернациональный долг в республике Афганистан, и их семей : постановление Совета министров СССР, 9 августа 1988 г., № 989. – URL: http://www.libussr.ru/doc_ussr/usr_14958.htm (дата обращения: 07.09.2025).
8. Министерство труда и социальной защиты Республики Беларусь. – URL: https://mintrud.gov.by/printv/ru/news-ru/view/15-fevralja-2024-goda-otmechaetsja-35-ja-godovschina-vyvoda-sovetskix-vojsk-iz-afganistana-7973-2024/ (дата обращения: 28.09.2025).
9. О создании при исполкомах всех уровней комиссии из числа депутатов, пред-

ставителей общественности и бывших воинов-интернационалистов, 5 марта 1989 г. // Сборник законов Белорусской ССР, указов Президиума Верховного Совета Белорусской ССР, постановлений Совета Министров Белорусской ССР 5 марта 1989 г. – 1986 – № 7 (1957). – Ст. 138-139.

10. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 7. Воп. 10. Спр. 1535.

11. О дополнительных мерах по улучшению материально-бытовых условий лиц, выполнявших интернациональный долг в Республике Афганистан, и их семей, 27 февраля 1989 г. // Сборник законов Белорусской ССР, указов Президиума Верховного Совета Белорусской ССР, постановлений Совета Министров Белорусской ССР 25 марта 1989 г. – 1986 – № 9 (1959). – Ст. 162-163.

Паступіў у рэдакцыю 23.12.2025 г.

Кантакты: janka.m@mail.ru (Марцынкевіч Іван Анатольевіч)

***Martsynkevich I. A.*** **LEGAL BASIS OF SOCIAL SUPPORT FOR PARTICIPANTS IN LOCAL CONFLICTS AND INTERNATIONALIST SOLDIERS IN THE BSSR IN THE SECOND HALF OF THE 20TH CENTURY**

*The article is devoted to the study of the development of legal mechanisms that ensured social support for military personnel, participants in local military conflicts, and internationalist soldiers in the post-war period. The main trends in the formation of legislation aimed at providing them with social protection are analyzed, and changes in the regulatory and legal framework in connection with socio-political changes in the studied period are considered.*

**Keywords:** social security, social assistance, law, participants in military conflicts, local conflicts, internationalist soldiers, BSSR.